**МІНІСТЭРСТВА ЮСТЫЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

220004, г. Мінск, Калектарная, 10.
Тэл. 200-86-87, факс 200-97-55

**МИНИСТЕРСТВО ЮСТИЦИИ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ**

220004, г. Минск, Коллекторная, 10.
Тел. 200-86-87, факс 200-97-55

31.03.2005 № 06-11/436

На №

Каардынацыйны савет
Грамадскага аб'яднання
«Беларускія фабрыкі думкі»

пр-т Партызанскі, д.28, к.3, кв.22,
220000, г.Мінск

Пісьмовае папярэджанне

Юрыдычным адрасам Грамадскага аб'яднання "Беларускія фабрыкі думкі" (далей – ГА "БФД") да сённяшняга дня ўсё яшчэ з'яўляецца жылое памяшканне.

Але ж згодна з арт.8 Жыллёвага кодэксу Рэспублікі Беларусь жылыя памяшканні прызначаюцца для пражывання грамадзян, што сведчыць аб устанаўленні для іх спецыяльнага прававога рэжыму мэтавага выкарыстання.

Такім чынам, выкарыстанне жылога памяшкання для юрыдычнага адраса арганізацыі супярэчыць заканадаўству Рэспублікі Беларусь. Аднак, неабходныя меры па ліквідацыі парушэнняў арганізацыяй не прыняты да цяперашняга часу, нягледзячы нават на адпаведную інфармацыю адносна неабходнасці зрабіць гэта, якая была дадзена Міністэрствам юстыцыі Рэспублікі Беларусь (далей – Мінюст) нават праз сродкі масавай інфармацыі.

З улікам выкладзенага і кіруючыся артыкуламі 26, 27, 28 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб грамадскіх аб'яднаннях", Мінюст выносіць Савету ГА "БФД" пісьмовае папярэджанне.

Кіруючаму органу ГА "БФД" неабходна на працягу двух тыдняў ўстараніць азначаныя парушэнні, аб чым паведаміць Мінюсту пісьмова з прадстаўленнем адпаведных дакументаў адносна рэгістрацыі зменненняў у Статуце з нагоды перамены юрыдычнага адраса, засведчыўшы подпісы членаў кіруючага органа ў заяве адбіткам пячаткі.

Дадзенае пісьмовае папярэджанне можа быць абскарджана ў месячны тэрмін у Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь.

Першы намеснік
Міністра  А.С.Петраш

06 Харытон 203 27 93
29.03.2005 п.п. ГА"БФД»..doc